Инвариативный тест

Вучэбныя прадметы “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

1. Выберыце і запішыце па-беларуску словазлучэнне, у якім катэгорыя роду назоўніка ў рускай і беларускай мовах не супадае:

а) молодой кунгуру
б) глубокий колодец
в) дубовый шкаф
г) олимпийский чемпион

2. Адзначнце множналікавы назоўнік:

а) землякі
б) урокі
в) мінчане
г) граблі

3. Знайдзіце словазлучэнне, якое ў беларускай мове адрозніваецца склонавай формай залежнага слова. Запішыце словазлучэнне па-беларуску:

а) увидеть волков
б) благодарить родителей
в) собирать землянику
г) проветривать класс

4. Адзначце складаназалежны сказ з сузалежным аднародным падпарадкаваннем:

а) Гэта быў Ізя Левін, які не пайшоў на суботнік, бо меў даведку ад доктара, што ў яго хворае сэрца.

б) Я не знаю месяца больш за май шчаслівага, калі пушчы цешацца з гоману шумлівага, калі вербы ніцыя рвуцца ўвысь галінамі, калі скрозь пшаніцаю пахне над далінамі…

в) Туман туліўся нізка да затокі, дзе кананадай грукалі ільды, нібы з нябёс спусціліся аблокі папіць яе сцюдзёнае вады.

г) Нават сарокі не стракаталі, калі бачылі лісу, а бясшумна знікалі ў кронах бяроз, бо і ў іх раслі дзеці і яны баяліся за лёс малых.

5. Адзначце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе:

Дзіўны гук уразіў мой слых недзе далёка як мне здалося справа ад мяне спяваў паляўнічы рог і хоць я ведаў што ён гучыць у баку ад шляху дзікага палявання я мімаволі стаў часцей пазіраць у той край.

а) двухкроп’е, коска, коска, коска
б) двухкроп’е, коска, коска, коска, коска
в) коска, коска, коска, коска, коска
г) двухкроп’е, коска, коска, коска, коска, коска

6. Адзначце слова, у напісанні якога дапушчана памылка:

а) канферэнц-зала
б) саракапрацэнтны
в) узаема-ветлівасць
г) абсалютна правільны

7. Адзначце слова (словы), у якім (якіх) назіраецца прыпадабненне папярэдняга зычнага гука да наступнага мяккага (асіміляцыя):

а) сліва
б) згінуць
в) схіліцца
г) зняць
д) подзвіг

8. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі парамі слоў і іх сэнсавай характарыстыкай. Адзначце варыянт правільнага адказу:

А) ***беспадстаўны*** вывад – ***беспрычынны*** смех Б) ***актыўная*** пазіцыя – ***пасіўная*** канструкцыя В) жылое ***асяроддзе*** – абжыты ***асяродак*** Г) ***работа*** сэрца – друкаваная ***работа***	1. Амонімы 2. Мнагазначнае слова 3. Паронімы 4. Сінонімы 5. Антонімы

9. Стваральнік твора як цэлага, носьбіт канцэпцыі рэчаіснасці, погляду на свет, які выяўляецца ў творы

А. Біяграфічны аўтар
Б. Вобраз аўтара
В. Аўтар-творца
Г. Апавядальнік

10. У перакладзе з грэчаскай мовы азначае «дзеянне» …

А. .Эпас
Б. Лірыка
В. Драма

11. Якому мастацкаму кірунку адпавядае такі вобраз аўтара-мастака: самотны бунтар, аўтсайдар, які супрацьстаіць традыцыі, пакліканы вызваліць сябе і патэнцыйную аўдыторыю ад патрабаванняў грамадства.

А. Рэалізм

Б. Мадэрнізм
В. .Рамантызм
Г. Барока
Д. Постмадэрнізм
Е. Класіцызм

12. Цвёрдая форма лірычнага верша, якая складаецца з 14 радкоў па 11 складоў у кожным, са строгай рытмічнай і лагічнай структурай.

А. Балада
Б. Санет
В. Каламбур
Г. Верлібр

13. Мастацка-вобразнае азначэнне, якое падкрэслівае найбольш істотную ў дадзеным кантэксце прыкмету прадмета або з'явы; ўжываецца для таго, каб выклікаць у чытача бачны вобраз чалавека, рэчы, прыроды і г.д.

А. Метафара
Б. Эпітэт
В. Алегорыя
Г. Гіпербала
Д. Метанімія

14. Даслоўна прыведзенае ў творы аднаго аўтара выказванне іншага аўтара – як пацверджанне сваёй думкі аўтарытэтным, бясспрэчным сцвярджэннем, ці наадварот – як фармулёўка, якая патрабуе абвяржэння, крытыкі

А. Цытата
Б. Рэмінісцэнцыя
В. Стылізацыя
Г. Пародыя

15. Жанр, які свабодна спалучае ў сабе элементы іншых жанраў, філасофскі, публіцыстычны, літаратурна-крытычны ці белетрыстычны тэкст; кампазіцыя грунтуецца на асацыятыўнай логіцы; інтэграцыйным цэнтрам апавядання выступае індывідуальнае аўтарскае «я».

А. Аповесць
Б. Байка

В. Раман
Г. Эсэ

16. Як лічацца пры праверцы дыктанта два выпраўленні на месцы арфаграм ці пунктаграм?

17. Як ацэньваецца работа, ў якой ёсць 5–7 выпраўленняў не на месцы арфаграм (пунктаграм)?

18. Вызначце тып урока, асноўнай дыдактычнай мэтай якога з'яўляецца кантроль за ведамі, уменнямі і навыкамі:

а) урок-практыкум;
б) урок-семінар;
в) урок-залік;
г) урок-лекцыя;
д) урок-конкурс.

19.Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове і літаратуры заснавана на пяці ўзроўнях у адпаведнасці з псіхалогіяй засваення і авалодання ведамі. Адзначце, сутнасцю якога ўзроўню з'яўляецца ўзнаўленне вучэбнага матэрыялу на аснове разумення:

а) 1-га ўзроўню;
б) 2-га ўзроўню;
в) 3-га ўзроўню;
г) 4-га ўзроўню;
д) 5-га ўзроўню

20. Якому балу адпавядае крытэрый і паказчык ацэнкі ступені сфарміраванасці вучэбна-моўных уменняў і навыкаў:

Усвядомлена адрознівае вывучаныя моўныя з'явы на аснове параўнання і супастаўлення з іншымі з'явамі; свабодна выконвае заданні па ўзоры

21. Як ацэньваецца комплексная кантрольная рабоца, якая складаецца з дыктанта і дадатковых заданняў (фанетычных, лексічных, граматычных і інш.)?

22. Як лічацца пры праверцы дыктанта два выпраўленні на месцы арфаграм ці пунктаграм?